# Праблемы ўзаемаадносін польскіх улад з прадстаўнікамі канфесій нацыянальных меншасцей у Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг.

**Дудкін Яўген Якаўлевіч,**
Сярэдняя школа № 38 г. Гродна (г. Гродна, Беларусь)

*Разглядаюцца асаблівасці ўзаемаадносін у канфесійнай сферы дзяржаўных улад II Рэчы Паспалітай з нацыянальнымі меншасцямі Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд 1921–1939 гг.*

11 лістапада1918 г. была адроджана незалежная Польская дзяржава. На працягу трох год Версальская мірная дамова, плебісцыты ў Верхняй Сілезіі і Мазурах, савецка-польская вайна акрэслілі межы маладой II Рэчы Паспалітай, у якіх з таго часу пражывала вялікую колькасць няпольскага насельніцтва [1, s. 224]. Так, каля 30% грамадзян Польшчы былі прадстаўнікамі нацыянальных меншасцей [6, s. 98].

Некаторымі дзяржаўнымі коламі і часткай польскага грамадства Трактат нацыянальных меншасцей ці Малы Версальскі дагавор, які меў задачаю абарону правоў нацыянальных меншасцей, быў успрыняты як акт дыскрымінацыі. Так, “Gazeta Polska” у сваім номары за 16 чэрвеня 1919 года пісала, што “добра, калі дзяржавы, якія з’яўляюцца членамі Лігі Нацый і маюць права ўмешвацца ў нашыя ўнутраныя справы, будуць да нас адносіцца па-сяброўску, не будуць імкнуцца да алаблення Польшчы і пашырэння анархіі знутры яе” [8, с. 23–24].

Актыўная дзейнасць беларускіх каталіцкіх святароў, якая была накіравана на пашырэнне ўжытку беларускай мовы ў богаслужэнні нярэдка прыводзіла да турэмнага зняволення ксяндзоў, напрыклад, Вінцэнта Гадлеўскага. Самым пашыраным метадам было выкарыстанне польскімі каталіцкімі ўладамі па просьбе дзяржаўных улад перавод “каталіцкіх святароў-беларусаў у парафіі карэннай Польшчы”. Так, напрыклад, здааылася з ксяндзом В. Шутовічам, а вось Ф. Абрантовіч і Я. германовіч былі высланы ў Харбін, то бок, высланы за межы краіны. На пустыя месцы ў парафіях прызначаліся ксяндзы з ліку паланіфілаў [7, с. 53]. Вялікую ролю ў напрыжванні адносін паміж ксяндзамі-каталікамі і дзяржаўнымі ўладамі актыыўны ўдзел першых у партыі Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя, якая вяла барацьбу з палітыкай паланізацыі. У 1935 г. камуністы БССР адзначалі выказванні друкаванага выдання партыі “Беларуская Крыніца”: “Патрэбна царкву наблізіць да мас, зрабіць яе больш даступнай масам, а гэтамагчыма зрабіць толькі праз яе беларусізацыю” [5].

Становішча праваслаўнай царквы было яшчэ горшым, паколькі яна страціла статус дзяржаўнай, які мела ў часы Расійскай імперыі, і асацыявалася ў польскага бока з былой краінай-удзельніцай падзелаў Рэчы Паспалітай. Таму, напры-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

клад, у 1919–1921 гг. на акупанавай польскімі войскамі “начальнік акругі меў права патрабаваў у вышэйстаячых духоўных улад водзыву дадзенга святара, а ў выпадках, што не церпяць адкладаў, такая замена магла адбыцца і па адным распараджэнні грамадзянскай адміністрацыі” [10, с. 179].

Дзяржаўныя ўлады супрацьстаялі і перашкаджалі дзейнасці Літоўскага таварыства выхавання і апекі моладзі св. Казіміра, якое знаходзілася пад уплывам хрысціянскіх дэмакратаў. Справа ў тым, што дадзеная рэлігійная арганізацыя, зарэгістраваная ў 1925 г., вызначалася моцным нацыянальна-клерыкальным характарам [2, с. 38–39]. Дадзеная сітуацыя супярэчыла дзяржаўнай нацыянальнай палітыцы Польшчы. Прычыну ў пільным назіранні за літоўскімі святарамі прадстаўнікі польскіх унутраных органах бачылі ў магчымым выкарыстанні першых дзяржаўнымі органамі Літвы на сваю карысць, што было адхілена толькі ў 1935 г. [9, с. 12]. Так, польскія ўлады ужо ў 1924 г. ўзмацнілі кантроль над працаю літоўскіх ксяндзоў [3].

Трэба падкрэсліць, што афіцыйнымі прычынамі ўзмацнення кантролю былі фінансавыя запачычаннасці літоўскіх арганізацый, чые сябры, па меркаванні польскага боку, займаліся збіраннем інфармацыі для літоўскага ўрада ў Коўна. Таму польскімі ўладамі прымаліся ўсе меры дзеля пераводу ксяндзоў-літоўцаў у парафіі, дзе пражывала нелітоўскае насельніцтва, у літоўскіх парафіях вяліся польскамоўныя службы. Так, па абвінавачванню ў антыдзяржаўнай дзейнасці былі зачынены суполкі таварыства св. Казіміра ў некаторых вёсках у 1932 г. [4].

Такім чынам, польскія дзяржаўныя ўлады ў міжваенны перыяд стварэння монаэтнічнай дзяржавы выкарыстоўвалі розныя метады кантролю над святарамі, якія адносіліся да прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей, з мэтаю недапушчэння пашырэння культурніцка-асветніцткай працы з паследуючымі вынікамі супрацьстаяння з дзяржаўнаю ўладаю ці супрацоўніцтва каталіцкіх беларускіх ці літоўскіх святароў на карысць суседніх дзяржаў.

**Літаратура**


1. *Dybkowska, A.* Polskie dzje od czasow najdawniejszych do wspolczesnosci / A. Dybkowska, J. Jaryn. – Warszawa : Wydawnictwonaukowe PWN, 1994. – 378 s.
2. *Вабішчэвіч, А.М.* Дзейнасць літоўскіх культурна-асветніцкіх арганізацый на беларуска-літоўска-польскім памежжы ў 20–30-ыя гг. / А.М. Вабішчэвіч // Веснік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта. Серыя 1. – 2007. – № 1. – С. 36–41.
3. Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці. – Ф. 551. Воп. 1. Спр. 208: Пераспіс Старасты Лідскага павета Наваградскага ваяводства, адміністрацыі наваградскага ваяводства ў г. Наваградку, Міністэрства ўнутраных спраў Польшчы ў Лідскім павеце пра літоўскіх ксяндзо і настаўнікаў за 20.03 – 28.08.1924 г.
4. Інфармацыйны бюлетэнь аб Заходняй Беларусі / Камісія па вывучэньню Заходняй Беларусі Беларускай акадэміі навук. – Мінск : Беларуская акадэмія навук, 1933. – № 7. – С. 108.
5. Інфармацыйны бюлетэнь аб Заходняй Беларусі / Камісія па вывучэньню Заходняй Беларусі Беларускай акадэміі навук. – Мінск : Беларуская акадэмія навук, 1935. – № 9. – С. 80.
6. История южных и западных славян : в 2 т. : учебник / под ред. Г.Ф. Матвеева, З.С. Ненашевой. – 2-е изд. – Москва : Издательсвто МГУ, 2011. – Т. 2 : Новейшее время. – 272 с.
7. *Разуванава, К.С.* беларусі інстытут гаспадаркі І культуры ў Заходняй Беларусі (1926–1939 гг.) / К.С. Разуванава. – Мінск : беларуская навука, 2013. – 247 с. : іл.
8. *Прибылов, В.И.* Создание Лиги Наций и Польша / В.И. Прибылов // Советское славяноведение. – 1979. – № 5. – С. 10–28.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

9. *Сляшыньскі*, *В.* Нацыянальная палітыка польскіх улад на землях Усходняй Літвы і Заходняй Беларусі / В. Сляшыньскі // Беларускі гістарычны часопіс. – 2006. – № 9. – С. 9–15.
10. Христианство в Беларуси: история и современность : сб. науч. ст. / редкол.: А.А. Коваленя [и др.]. – Минск : Беларуская навука, 2014. – 494 с. [6]. л. цв. ил.
Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова